# Інструмент самастойнай ацэнкі моладзевай палітыкі



Youth – Jeunesse

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE

*The opinions expressed in this work are the responsibility of the authors and do not necessarily reflect the official policy of the Council of Europe.*

All requests concerning the reproduction or translation of all or part of this document should be addressed to the Directorate of Communication (F-67075 Strasbourg Cedex or publishing@coe.int). All other correspondence concerning this document should be addressed to the Directorate General of Democracy – Youth Department (youth@coe.int).

Cover and layout: Documents and Publications Production Department (SPDP), Council of Europe

Photos: © Council of Europe

This publication has not been copy-edited by the SPDP Editorial Unit to correct typographical and grammatical errors.

© Council of Europe, February 2021

Printed at the Council of Europe



# Уводзіны

Адной з прыярытэтных задач міжурадавага супрацоўніцтва Савета Еўропы ў моладзевай сферы з'яўляецца прасоўванне і падтрымка развіцця моладзевай палітыкі.

Выкананне гэтай задачы з’яўляецца адказнасцю Еўрапейскага кіруючага камітэта па справах моладзі (CDEJ), у якім прымаюць удзел прадстаўнікі міністэрстваў ці органаў, адказных за пытанні моладзі, з 50 дзяржаў-удзельніц Еўрапейскай Культурнай канвенцыі.

CDEJ спрыяе супрацоўніцтву паміж урадамі ў моладзевым сектары і забяспечвае аснову для супастаўлення нацыянальных моладзевых палітык, абмену перадавым досведам і распрацоўкі нарматыўных дакументаў.

Менавіта ў гэтым кантэксце CDEJ афіцыйна прызнаў дадзены інструмент самаацэнкі для распрацоўкі моладзевай палітыкі і заклікаў дзяржавы-ўдзельніцы выкарыстоўваць і распраўсюджваць яго.

# Перадумовы распрацоўкі інструмента самастойнай ацэнкі

У адсутнасць механізмаў кантролю за ажыццяўленнем працы моладзевага сектара Савета Еўропы, CDEJ палічыла, што ўрады краін-удзельніц усё больш патрабуюць распрацоўкі крытэраў “вымярэння” і метадаў для ацэнкі прагрэса, дасягнутага з цягам часу.

Таму CDEJ палічыў неабходным распрацаваць набор кантрольных паказчыкаў якасці для моладзевай палітыкі, заснаваны, у прыватнасці, на рэкамендацыях, прынятых Камітэтам міністраў (ці, пры патрэбе, на тэкстах, прынятых іншымі адпаведнымі органамі Савета Еўропы).

У сувязі з такімі паказчыкамі якасці быў распрацаваны інструмент самастойнай ацэнкі моладзевай палітыкі з стандартнымі паказчыкамі, каб органы ўлады, адказныя за ажыццяўленне моладзевай палітыкі, маглі б вызначаць маштабы прагрэсу, дасягнутага падчас распрацоўкі і ажыццяўлення моладзевай палітыкі на нацыянальным узроўні, і ўносіць неабходныя папраўкі.

ацаніць выкананне імі стандартаў моладзевай палітыкі Савета Еўропы і служыць асновай для развіцця моладзевай палітыкі ў патрэбным тэмпе.




# Асноўныя прынцыпы нацыянальнай моладзевай палітыкі ў адпаведнасці з нормамі Савета Еўропы

За гады працы Савет Еўропы распрацаваў вялікую колькасць прынцыпаў, мэт і каштоўнасцей, якія закліканы спрыяць моладзевай палітыцы.

Па меркаванні Савета Еўропы, кожная моладзевая палітыка павінна спрыяць выкананню наступных прынцыпаў[1]:

a. Мэтанакіравана інвеставаць у моладзь узгодненым і ўзаемадапаўняльным чынам, па магчымасці праз метад, арыентаваны на развіццё іх магчымасцяў, а не на праблемы і, дзе гэта патрэбна, распрацоўваць стандарты і інструменты моладзевай палітыкі;

b. Даваць моладзі магчымасць прымаць удзел ў распрацоўцы моладзевай палітыкі і ўлічваць меркаванне моладзі наконт эфектыўнасці яе ажыццяўлення;

c. Ствараць умовы для навучання і набыцця досведу, якія дазволяць моладзі развіваць свае веды, навыкі і ўменні, неабходныя для сучаснага рынку працы і жыцця ў грамадзянскай супольнасці;

d. Стварыць сістэму маніторынгу як для ацэнкі эфектыўнасці моладзевай палітыкі, гэтак і для выяўлення “прабелаў” у палітыцы, якія ўплываюць на эфектыўнасць аказання дапамогі маладым людзям, якія адносяцца да пэўнай сацыяльнай групы, знаходзяцца ў пэўнай мясцовасці ці ўмовах;

e. Дэманстраваць гатовасць пераадольваць узніклыя “прабелы” і рашаць праблемы там, дзе яны ўзнікаюць.

Дадзеныя прынцыпы закладваюць аснову моладзевай палітыкі. Краінам-удзельніцам рэкамендавана сачыць за ўплывам і эфектыўнасцю ажыццяўлення моладзевай палітыкі і быць падрыхтаванымі да неабходных змен (ці нават да адмовы ад уведзенай палітыкі) у выпадку, калі тыя ці іншыя меры апынаюцца часткова альбо цалкам неэфектыўнымі.

Тым не менш, дзейны інструмент не арыентуецца непасрэдна на ключавыя прынцыпы моладзевай палітыкі, апісаныя вышэй. Усе зацікаўленыя бакі, што жадаюць ацаніць іх адпаведнасць гэтым прынцыпам на розных узроўнях (мясцовым, рэгіянальным, нацыянальным ці еўрапейскім), могуць скарыстацца інструментаром па стандартах якасці, распрацаваным Еўрапейскім моладзевым форумам (YFJ), які ахапляе большасць пералічаных вышэй прынцыпаў[2].

Дадзены інструмент самаацэнкі засяроджваецца на іншым, бо ён пэўна тычыцца выканання стандартаў Савета Еўропы па моладзевай палітыцы.

1. Крыніца: “Савет Еўропы і моладзевая палітыка: падтрымка, дапамога і рэсурсы для развіцця моладзевай палітыкі ў краінах-членах” (2016 год). Гэтыя прынцыпы былі ўзяты з розных ключавых дакументаў Савета Еўропы па моладзевай палітыцы, у тым ліку кола вядзення Еўрапейскага кіруючага камітэта па справах моладзі (CDEJ) і Кансультацыйнага савета па справах моладзі (CCJ), Кампендыума па моладзевай палітыцы (2012 г.), спасылаючыся на даканцовы даклад Працоўнай групы па паказчыках моладзевай палітыкі за 2003 год.
2. https://www.youthforum.org/toolkit-quality-standards-youth-policy






# Асноўныя нормы Савета Еўропы ў дачыненні моладзевай палітыкі

**З**годна CDEJ, маштабы і накіраванасць моладзевай палітыкі Савета Еўропы павінны прасоўваць асноўныя каштоўнасці Арганізацыі (правы чалавека, дэмакратыю і вяршынства закону).

Шэсць асноўных галін дзейнасці (глядзі Дыяграму) моладзевай палітыкі Савета Еўропы заснаваны на стандартах, прынятых Саветам Еўропы ў дачыненні моладзі (галоўным чынам, рэкамендацыі Камітэта міністраў). Яны павінны служыць асновай для кожнай будучай распрацоўкі моладзевай палітыкі ў рамках Арганізацыі.








# Як выкарыстоўваць інструмент самаацэнкі моладзевай палітыкі

Дадзены інструмент накіраваны дапамагчы дзяржавам-удзельніцам, а таксама іншым грамадскім зацікаўленым бакам, на розных узроўнях (мясцовым, рэгіянальным, нацыянальным і міжнародным) самастойна ацаніць уласную адпаведнасць стандартам Савета Еўропы на аснове шасці кірункаў (удзел, інфармацыя, далучэнне, доступ да правоў, моладзевая праца і мабільнасць), якія ляглі ў аснову палітыкі Савета Еўропы ў дачыненні ўдзелу моладзі і яе развіцця.

Неабходна таксама фармаваць у моладзі прыхільнасць еўрапейскім каштоўнасцям і, больш пэўна, асноўным каштоўнасцям Савета Еўропы (правы чалавека, вяршынства закону, дэмакратыя). Савет Еўропы заўсёды спрыяў разуменню моладзевай палітыкі, заснаванай на агульных еўрапейскіх каштоўнасцях і адчуванні прыналежнасці да Еўропы. Такім чынам, гэты еўрапейскі аспект варта прасоўваць па шасці кірунках моладзевай палітыкі Савета Еўропы.

Для кожнай з гэтых пазіцый уплыву дадзены інструмент змяшчае пэўныя і вымерныя паказчыкі, з дапамогай якіх дзяржавы-члены могуць ацаніць поспехі ў ажыццяўленні моладзевай палітыкі ў кантэксце асноўных стандартаў Савета Еўропы (маюцца на ўвазе, галоўным чынам, рэкамендацыі Камітэта міністраў).

Такім чынам, крытэры самастойнай ацэнкі могуць дапамагчы ацаніць маштаб прагрэсу па кожным паказчыку.

У адпаведнасці з аналагічнымі інструментамі, што выкарыстоўваюцца ў Савеце Еўропы[3], дадзены інструмент можа дапамагчы дзяржавам-членам:

- павялічыць дасведчанасць і палепшыць разуменне моладзевай палітыкі;
- правесці самастойную адзнаку ажыццяўлення моладзевай палітыкі;
- вызначыць меры, неабходныя для ажыццяўлення моладзевай палітыкі;
- выявіць перадавы досвед і абменьвацца ім;
- вымераць вынікі цягам часу.

Дзяржавам-удзельніцам прапануецца выкарыстоўваць гэты інструмент актыўна, калі гэта патрэбна, шляхам самастойнай ацэнкі іх адпаведнасці нормам Савета Еўропы. У гэтым дачыненні дадзены інструмент дазваляе карыстальнікам адзначыць станоўчыя тэндэнцыі, і таксама вызначыць кірункі далейшай працы.

Дадзены інструмент галоўным чынам арыентаваны на тыя краіны-удзельніцы, дзе моладзевая палітыка з'яўляецца пытаннем нацыянальнай кампетэнцыі. Тым не менш, інструмент таксама можна выкарыстоўваць у федэрацыйных дзяржавах ці ў краінах, дзе праблемы моладзі вырашаюцца на рэгіянальным і мясцовым узроўні, хоць гэта, напэўна, патрабуе дадатковага супрацоўніцтва і супольнай працы розных кампетэнтных органаў.

Дзяржавам-членам прапануецца давесці гэты інструмент да адпаведных зацікаўленых бакоў (напрыклад, да міністэрстваў, якія адказваюць за працу з моладдзю ці да іншых устаноў, моладзевых арганізацый, моладзевых рад, рэгіянальных і мясцовых органаў улады, прафесійных груп, што працуюць з моладдзю), каб спрыяць ажыццяўленню моладзевай палітыкі ў Еўропе.

3. Глядзі "Інструмент ацэнкі ўдзелу дзяцей": інструмент самастойнай ацэнкі прагрэсу, што ажыццяўляе Рэкамендацыі CM/Rec(2012)2 Камітэта міністраў дзяржавам-членам аб ўдзеле дзяцей і моладзі ў веку да 18 гадоў.

# Кароткае апісанне асноўных паказчыкаў, з дапамогай якіх можна ацаніць поспех моладзевай палітыкі ў кантэксце стандартаў Савета Еўропы

| Зона ўплыву | Адпаведныя паказчыкі |
|---|---|
| **Удзел** | ► Моладзевая палітыка спрыяе актыўнаму ўдзелу ўсей моладзі ў прыняцці рашэнняў, асабліва тых рашэнняў, якія датычацца іх непасрэдна.<br>► Урад прызнае і падтрымвае моладзевыя арганізацыі, моладзевыя рады і іншыя моладзевыя праекты ці структуры. |
| **Інфармацыя** | ► Моладзевая палітыка падае інфармацыю, патрэбную моладзі, а таксама вольны доступ да яе, як афлайн, гэтак і анлайн.<br>► Моладзевая палітыка стварае магчымасці для моладзі развіваць свае навыкі і ўменні, дзеля пісьменнага выкарыстання інфармацыі. |
| **Далучэнне** | ► Моладзевая палітыка спрыяе далучэнню моладзі да важных аспектаў жыцця чалавека (у тым ліку навучанне і прафесійную падрыхтоўку, працу, жытло, ахову здароўя, спорт, хобі і культуру).<br>► Моладзевая палітыка накіравана на прадухіленне дыскрымінацыі, гвалту і нераўнапраўя, з якімі сутыкаецца моладзь, незалежна ад прычын[4]. |
| **Доступ да правоў** | ► Моладзевая палітыка палягчае доступ моладзі да правоў і прыбірае кожныя юрыдычныя, адміністрацыйныя ці фактычныя перашкоды.<br>► Моладзевая палітыка спрыяе скаардынаванаму падыходу да пашырэння доступу моладзі да правоў пры супрацоўніцтве ўва ўсіх адпаведных сферах палітыкі на міжнародным, нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. |
| **Моладзевая праца** | ► Арганізацыя і далейшае развіццё якаснай моладзевай працы гарантуецца і актыўна падтрымліваецца ў мясцовай, рэгіянальнай ці нацыянальнай моладзевай палітыцы.<br>► Веды і навыкі аплатных і добраахвотных моладзевых працаўнікоў гарантуе якасную працу адмыслоўцаў па працы з моладдзю. |
| **Мабільнасць** | ► Моладзевая палітыка падтрымлівае мабільнасць моладзі, у прыватнасці дзеля ўмацавання еўрапейскай ідэнтычнасці.<br>► Моладзевая палітыка заахвочвае развіццё якасных праектаў, накіраваных на падтрымку мабільнасці моладзі. |

4. Як прама ўказана ў артыкуле 14 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека ці ў кожнай іншай форме, устаноўленай прэцэдэнтным правам Еўрапейскага суда па правах чалавека.

## УДЗЕЛ

| Зона ўплыву Удзел |
|---|
| ► Заканадаўчыя асновы Рэкамендацыі Rec(2006)14 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб грамадзянстве і моладзевым ўдзеле у грамадскім жыцці” |
| ► Рэкамендацыі Rec(2004)13 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб ўдзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях” |
| ► Перагледжаная Еўрапейская хартыя “Аб ўдзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях” Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы |
| ► Рэкамендацыі Rec(2006)1 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб ролі нацыянальных моладзевых рад ў фармаванні моладзевай палітыкі” |
| ► Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека, артыкул 11 (свабода сходаў і аб’яднанняў) |
| ► Рэкамендацыя “Аб ўдзеле дзяцей і моладзі ў веку да 18 гадоў і інструменце ацэнкі ўдзелу дзяцей” |

**Паказчык 1**

Моладзевая палітыка спрыяе актыўнаму ўдзелу моладзі ў прыняцці рашэнняў, асабліва тых, якія датычацца іх непасрэдна, і заклікае моладзь быць актыўнымі грамадзянамі.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры поўнай меры[5] | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Моладзевая палітыка дапамагае моладзі быць актыўнымі грамадзянамі, у прыватнасці, дае ім магчымасці і досвед удзелу ў грамадскім жыцці. | | | | |
| Ствараюцца адпаведныя структуры ці праграмы, што дазваляюць усім маладым людзям, у тым ліку тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы, прымаць удзел у дыскусіях і прыняцці рашэнняў, якія іх датычацца. | | | | |
| Заахвочваецца абмен паспяховым досведам і яго выкарыстанне дзеля эфектыўных і інавацыйных формаў удзелу моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях. | | | | |

5. Альбо “У працэсе”

| Паказчык 2 |
| --- |
| Урад прызнае і падтрымвае моладзевыя арганізацыі, моладзевыя рады і іншыя моладзевыя праекты ці структуры. |

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Гарантуецца права моладзі на ўзаемадзеянне з зацікаўленымі партнёрамі, дзеля фармавання органаў калектыўнага прыняцця рашэнняў. | | | | |
| Моладзевым арганізацыям, радам і ініцыятывам даюцца прасторы, фінансавыя сродкі і матэрыяльная падтрымка, патрэбныя для забеспячэння іх эфектыўнай працы. | | | | |
| Незалежныя моладзевыя арганізацыі і рады дзейнічаюць на мясцовым, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях і адыгрываюць актыўную ролю ў распрацоўцы і ажыццяўленні моладзевай палітыкі. | | | | |

| Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу |
| --- |
| |

| Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры |
| --- |
| |

## Заканадаўчыя асновы

- Рэкамендацыя CM/Rec(2010)8 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб моладзевай інфармацыі”
- Рэкамендацыя № R (90) 7 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ адносна моладзевай інфармацыі і кансультацый у Еўропе
- Іншыя важныя ініцыятывы Савета Еўропы:
  - Стратэгіі кіравання інтэрнэтам на 2016-2019
  - Рэкамендацыя R(97)20 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ па пытаннях мовы варожасці
  - Кампанія “Рух супраць мовы варожасці” (No Hate Speech Movement)

## Паказчык 1

Моладзевая палітыка падае інфармацыю, патрэбную моладзі, а таксама вольны доступ да яе, як афлайн, гэтак і анлайн.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Моладзевыя інфармацыйна-кансультацыйныя паслугі даюцца на мясцовым ці рэгіянальным узроўнях. | | | | |
| Моладзевыя інфармацыйна-кансультацыйныя паслугі даюцца на нацыянальным узроўні. | | | | |
| Формы і сеткі моладзевай інфармацыі адаптуюцца да інфармацыйных патрэбаў моладзі, якія ўвесь час пашыраюцца, у тым ліку новыя інфармацыйныя тэхналогіі. | | | | |
| Моладзь ўдзельнічае ў стварэнні інфармацыйнага кантэнта і інфармацыйных сетак. | | | | |
| Моладзевыя інфармацыйна-кансультацыйныя паслугі накіраваны, галоўным чынам, на задавальненне патрэбаў маладых людзей, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. | | | | |

## Паказчык 2

Моладзевая палітыка стварае магчымасці для маладых людзей развіваць свае навыкі і ўменні, дзеля пісьменнага выкарыстання інфармацыі.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Інфармацыйная/лічбавая пісьменнасць, у тым ліку крытычнае мысленне, з'яўляецца часткай фармальнай адукацыі. | | | | |
| Інфармацыйная/лічбавая пісьменнасць, у тым ліку крытычнае мысленне, з'яўляецца часткай нефармальнай ці пазафармальнай адукацыі. | | | | |
| Моладзевая палітыка павялічвае дасведчанасць моладзі пра рызыкі, з якімі яна сутыкаецца ў віртуальным свеце, у тым ліку ў дачыненні абароны іх асабістых звестак. | | | | |

## Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу

## Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры

| Заканадаўчыя асновы |
|---|
| ► Рэкамендацыя CM/Rec(2015)3 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб доступе моладзі з праблемнага асяроддзя да сацыяльных правоў” (праект ENTER)<br>► Рэкамендацыя CM/Rec(2016)7 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб доступе моладзі да правоў” |

**Паказчык 1**

Моладзевая палітыка спрыяе далучэнню моладзі ў сацыяльна небяспечнай жыццёвай сітуацыі да ўсіх сфер жыцця грамадства (у тым ліку навучання і прафесійнай падрыхтоўкі, працы, жытла, аховы здароўя, спорту, хобі і культуры).

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| У моладзевай палітыцы дадатковая ўвага надаецца патрэбам моладзі, што знаходзіцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. | | | | |
| Прадугледжаны пэўныя меры з мэтай стымуляваць далучэнне моладзі, галоўным чынам да і праз, працу, мабільнасць, удзел у жыцці грамадства і атрыманне верагоднай інфармацыі. | | | | |
| Моладзевая палітыка дапамагае сферы адукацыі далучаць моладзь да жыцця грамадзянскай супольнасці. | | | | |
| Ажыццяўленне моладзевай палітыкі накіравана на спрыянне занятасці моладзі. | | | | |
| Ажыццяўленне моладзевай палітыкі накіравана на вырашэнне жыллёвых пытанняў і здаровы лад жыцця моладзі. | | | | |

**Паказчык 2**

Моладзевая палітыка накіравана на прадухіленне дыскрымінацыі, гвалту і нераўнапраўя, з якімі сутыкаюцца маладыя людзі, незалежна ад прычын[6]

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Прадугледжаны пэўныя меры, каб дазволіць маладым людзям быць актыўнымі грамадзянамі без дыскрымінацыі. | | | | |
| Прызнаецца асаблівая ўразлівасць некаторых маладых людзей да дыскрымінацыі і стыгматызацыі, а таксама распрацаваны меры па недапушчэнні такіх негатыўных з'яў. | | | | |
| Прымаюцца меры, што спрыяюць сацыяльнаму згуртаванню маладых людзей з розных пластоў грамадства, у тым ліку ў рамках моладзевай працы. | | | | |

**Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу**

**Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры**

6. Як прама ўказана ў артыкуле 14 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека ці ў кожнай іншай форме, устаноўленай прэцэдэнтным правам Еўрапейскага суда па правах чалавека.

**Заканадаўчыя асновы**

- Рэкамендацыя CM/Rec(2016)7 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ "Аб доступе моладзі да правоў"
- Рэкамендацыя CM/Rec(2010)7 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ адносна Хартыі Савета Еўропы па адукацыі для дэмакратычнага грамадзянства і адукацыі ў галіне правоў чалавека

**Паказчык 1**

Моладзевая палітыка палягчае доступ моладзі да правоў і прыбірае кожныя юрыдычныя, адміністрацыйныя ці фактычныя перашкоды.[7]

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Моладзевая палітыка спрыяе знішчэнню перашкод для доступу моладзі да адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі і дае прафесійныя магчымасці для ўсіх маладых людзей. | | | | |
| Маладым людзям аказваецца падтрымка для пераадолення цяжкасцяў, з якімі яны сутыкаюцца, а менавіта: забеспячэнне стабільнай занятасці і пераадоленне негатыўных наступствах цяжкіх жыццёвых сітуацый. | | | | |
| Прадугледжаны меры па задавальненні пэўных патрэбаў маладых людзей, звязаныя з сацыяльным і медычным абслугоўваннем. | | | | |

**Паказчык 2**

Моладзевая палітыка спрыяе скаардынаванаму падыходу да пашырэння доступу маладых людзей да правоў пры супрацоўніцтве ўва ўсіх адпаведных сферах палітыкі на міжнародным, нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Моладзевая палітыка забяспечвае доступ да адукацыі ў галіне дэмакратычнай грамадзянскасці і правоў чалавека. | | | | |
| Зацікаўленыя бакі, што займаюцца праблемамі моладзі ўва ўсіх адпаведных галінах палітыкі, узаемадзейнічаюць адзін з адным і супрацоўнічаюць з мэтай паляпшэння доступу моладзі да яе правоў. | | | | |
| Праводзяцца агляды існых і запланаваных законаў ці праграм, якія заахвочваюць і гарантуюць доступ моладзі да правоў, а таксама распрацаваны абавязковыя меры па іх рэалізацыі. | | | | |

**Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу**

**Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры**

7. Доступ да правоў, уключаных у Рэкамендацыю CM/Rec(2016)7, якія ўжо былі разгледжаны ў іншых кірунках працы (напрыклад, удзел, далучэнне), незалежна ад узроўня паказчыкаў ці крытэраў ацэнкі, пэўна тут не разглядаюцца.

## Заканадаўчыя асновы

► Рэкамендацыя CM/Rec(2017)4 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб моладзевай працы”

## Паказчык 1

Арганізацыя і далейшае развіццё якаснай моладзевай працы гарантуецца і актыўна падтрымліваецца ў мясцовай, рэгіянальнай ці нацыянальнай моладзевай палітыцы.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Распрацаваны розныя стратэгіі, праграмы, нарматыўна-праўныя акты, устойлівыя структуры і рэсурсы, якія падтрымваюць працу з моладдзю. | | | | |
| Роўны доступ да моладзевай працы для ўсіх маладых людзей заахвочваецца праз эфектыўнае супрацоўніцтва паміж сектарамі і адпаведныя палітыкі. | | | | |
| Адмыслоўцы па працы з моладдзю і сама моладзь актыўна прымаюць удзел у развіцці моладзевай працы. | | | | |

## Паказчык 2

Веды і навыкі аплатных і добраахвотных моладзевых працаўнікоў гарантуе якасную працу адмыслоўцаў па працы з моладдзю.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Распрацавана ўніверсальная праграма навучання адмыслоўцаў па працы з моладдзю, як аплатных, гэтак і добраахвотных, на падставе кампетэнтнаснага падыходу. | | | | |
| Адукацыйныя праграмы улічваюць існую практыку і досвед моладзевай працы, а таксама інавацыйныя формы і метады працы. | | | | |
| Зацікаўленыя бакі, у тым ліку адмыслоўцаў па працы з моладдзю і маладыя людзі, бяруць удзел у распрацоўцы гэтых адукацыйных праграм. | | | | |

## Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу

## Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры

## Заканадаўчыя асновы

- Рэзалюцыя (91) 20, якая прадугледжвае Частковае пагадненне па “Моладзевай карце” з мэтай прасоўвання і спрыяння мабільнасці моладзі ў Еўропе
- Рэкамендацыя R (95) 18 Камітэта міністраў дзяржавам-членам СЕ “Аб мабільнасці моладзі”

## Паказчык 1

Моладзевая палітыка падтрымлівае мабільнасць моладзі, у прыватнасці дзеля ўмацавання еўрапейскай ідэнтычнасці.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Распрацаваны нарматыўныя дакументы, прадугледжаны праграмы і магчымасці для сацыяльнай, культурнай, адукацыйнай і эканамічнай мабільнасці моладзі. | | | | |
| Даступныя інфармацыйна-кансультацыйныя паслугі, арыентаваныя на мабільнасць моладзі. | | | | |
| Праекты мабільнасці моладзі спрыяюць умацаванню пачуцця прыналежнасці да Еўропы, галоўным чынам, праз каштоўнасці Савета Еўропы і прынцыпы міжкультурнага навучання. | | | | |

## Паказчык 2

Моладзевая палітыка заахвочвае развіццё якасных праектаў, накіраваных на падтрымку мабільнасці моладзі.

| Крытэры самастойнай ацэнкі | Так | Не ў поўнай меры | Не | Прыклады эфектыўнай практыкі |
|---|---|---|---|---|
| Праекты мабільнасці моладзі абапіраюцца на такія прынцыпы якасці, як апісана, напрыклад, у “Еўрапейскай хартыі якасці для мабільнасці моладзі ў адукацыі”. | | | | |
| Веды пра паспяховыя практыкі ў галіне моладзевай мабільнасці выкарыстоўваюцца для прыняцця больш эфектыўных рашэнняў наконт дзяржаўнай моладзевай палітыкі. | | | | |

## Станоўчыя тэндэнцыі да далейшага прагрэсу

## Пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі, і магчымыя дадатковыя меры

Далучэнне моладзі да еўрапейскіх каштоўнасцяў, а менавіта да асноўных каштоўнасцяў Савета Еўропы (правы чалавека, вяршынства закону, дэмакратыя), з'яўляецца вылучна важным. Савет Еўропы заўсёды спрыяў распрацоўцы моладзевай палітыкі, якая засноўваецца на агульных еўрапейскіх каштоўнасцях і на адчуванні прыналежнасці да Еўропы.

Менавіта ў гэтым кантэксце Еўрапейскі кіруючы камітэт па справах моладзі (CDEJ) афіцыйна прыняў дадзены інструмент самаацэнкі для распрацоўкі моладзевай палітыкі.

Гэты інструмент быў распрацаваны з мэтай дапамагчы дзяржавам-удзельніцам самастойна ацаніць выкананне імі стандартаў моладзевай палітыкі Савета Еўропы і служыць асновай для развіцця моладзевай палітыкі ў патрэбным тэмпе. Спадзяемся, што гэты практычны дапаможнік апынецца карысным краінам-членам і ўсім іншым бакам, зацікаўленым у працы па выяўленні перадавога досведу і арганізацыі абмену ім. А з цягам часу − і ў вызначэнні маштабаў свайго прагрэсу.

PREMS 011421

BEL

www.coe.int

Савет Еўропы з'яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне праў чалавека. У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 47 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Праў чалавека і асноўных свабод - дамову, распрацаваную для абароны праў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закона. Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах.

Youth – Jeunesse

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE